

Святлана Ігнатовіч, Ільля Мамікаў і Наталля Нікіціна



Дружная каманда манцёраў пуцей у складзе Юрыя Гласковіча, Сяргея Якубава, Сяргея Жылінскага і Віктара Нікіціна

# Яркай зоркай гарыць чырвоны семафор



**У АБ'ЕКТЫВЕ – КАЛЕКТЫЎ**

**Напярэдадні прафесійнага свята работнікаў чыгункі накіроўваемся на станцыю «Лепель», якая з'яўляецца завяршальнай у Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі.**

Вядома, што чыгунка трывала ўвайшла ў жыццё чалавека. Дзякуючы цягнікам мы маем магчымасць адправіцца ў любы горад Беларусі або краіны замежжа. Нягледзячы на тое, што аўтамабіль ёсць практычна ў кожнай сям'і, чыгуначны транспарт не страчвае сваёй папулярнасці.

Як жа ўзнікла станцыя «Лепель»? У 1924 годзе Саветам працы і абароны было прынята рашэнне пра неадкладнае будаўніцтва лініі «Орша – Лепель», і ў маі 1925-га ваенныя чыгуначнікі прыступілі да будаўніцтва палатна.

Калі хтосьці лічыць, што ўзвядзенне станцыі было простай справай, ён глыбока памыляецца. Усе земляныя работы ў асноўным праводзіліся ўручную. З транспарту выкарыстоўваліся толькі конная цяга і адзін экскаватар. Аднак пры ўсіх складанасцях першы цягнік па ўсёй чыгуначнай лініі ўрачыста прайшоў ужо ў лістападзе 1925 года.

Складанымі былі гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзеля недапушчэння паставак варожага ўзбраення на фронт, партызаны былі вымушаны падрываць, псаваць лінію. Аднак вельмі хутка яна аднаўлялася, бо была вельмі патрэбнай.

Хто ж працуе на чыгунцы? На розум адразу прыходзяць такія прафесіі, як машыніст і касір. Аднак гэты спіс значна шырэйшы: саставіцель цягнікоў, камерцыйны агент, дзяжурны па чыгуначнай станцыі і іншыя. Усе яны выконваюць шэраг важных абавязкаў і ўносяць вялікі ўклад у агульную справу.

У штаце станцыі «Лепель» налічваецца 5 дзяжурных, 5 камерцыйных агентаў, 4 саставіцелі цягнікоў і ўласна кіраўнік – усяго 15 супрацоўнікаў.

Як адзначае начальнік станцыі **Ілья Мамікаў**, выпадковых людзей тут не бывае. Працоўны калектыў складаюць людзі, якія адпавядаюць прад'яўленым да іх патрабаванням, бо чыгунка патрабуе асаблівай адказнасці і ўвагі.

Вось, напрыклад, дзяжурны прымае і адпраўляе цягнікі, сочыць за бяспекай руху і выконвае манеўровыя работы – перамяшчае рухомы склад у межах станцыі, а ў асобных выпадках – і з выездам на перагон. Гэту работу з 1985 года выконвае **Наталля Нікіціна**. Як чалавеку адказнаму і вопытнаму, ёй можна даверыць любую складаную працу.

Немагчыма не адзначыць напярэдадні свята і дзяжурных па станцыі **Вікторыю Кляшторную, Алу Дзмітрук і Таццяну Мельнікаву.** Для гэтых жанчын, як і для Наталлі Нікіцінай, Беларуская чыгунка з'яўляецца першым і адзіным месцам працы, якое жанчыны мяняць не збіраюцца.

Знайшла сваё прызванне ў любімай прафесіі і малады спецыяліст **Вераніка Сакалоўская.** Вопытныя калегі заўсёды рады падтрымаць дзяўчыну і шчырай парадай, і добрым словам.

Жанчыны працуюць перад вялікім табло са шматлікімі кнопкамі і лямпачкамі, дзе размешчаны паўторнікі паказанняў святлафораў або саставаў, што прыбываюць. Дзякуючы працы гэтых жанчын вытрымліваюцца дакладныя графікі, а саставы прыязджаюць роўна на пазначаную платформу.

Дзяжурныя пераводзяць стрэлкі, адкрываюць сігналы і даюць каманду, куды ехаць. Пакуль не адкрыюць сігнал, машыніст бачыць чырвоны колер і не мае права пачаць рух.

**Алена Дзямянка, Ірына Каваленка, Вольга Глушакова, Святлана Ігнатовіч і Людміла Дзеравяга** працуюць агентамі камерцыйнымі па транспартным абслугоўванні. Іх абавязак – размяшчэнне грузаў і багажу ў вагоне, суправаджэнне, а таксама забеспячэнне іх захаванасці ў дарозе. Жанчыны займаюцца таксама афармленнем суправаджальных дакументаў пры прыёме грузаў, багажу, здачай іх на станцыях прызначэння, забеспячэннем пагрузачна-разгрузачных работ падчас стаянкі цягніка на станцыях, а таксама назіраннем за тэхнічным станам вагона ў дарозе.

Да таго ж работніцы вядуць разлікі з кліентамі за перавозку грузаў, багажу і аказаныя паслугі, сярод якіх – пагрузачна-разгрузачныя работы і захоўванне грузу. Жанчыны правяраюць правільнасць афармлення дакументаў па прыёме, пагрузцы, выдачы грузаў, шэраг іншых справаздачных дакументаў, а таксама забяспечваюць захаванасць бланкаў строгай справаздачнасці.

Некаторыя з працаўніц шчыруюць на станцыі больш за 20 гадоў, а вось для Святланы Ігнатовіч чыгунка ўвогуле стала першым месцам працы, родным і дарагім месцам.

Расфарміраванне і фарміраванне саставаў, груп вагонаў, адчэпка, прычэпка вагонаў да цягнікоў, падача вагонаў на пагрузачна-разгрузачныя, іншыя спецыялізаваныя шляхі і ўборка іх з гэтых пуцей, перастаноўка вагонаў і саставаў са шляху на шлях – гэтую і шматлікія іншыя задачы выконваюць саставіцелі цягнікоў **Андрэй Амосенка, Аляксандр Каваленка, Аляксандр Кузьмічонак і Андрэй Якубаў.**

Асаблівых слоў павагі заслугоўвае і кіраўнік станцыі. Ілья Мамікаў скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту па спецыяльнасці «Арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце». Па размеркаванні прыехаў працаваць дзяжурным на станцыю «Чашнікі». Праз 4 гады быў пераведзены на «Мінск-Пасажырскі» дзяжурным па парку. І вось ужо 3 гады Ілья Анатольевіч кіруе дружным калектывам у г. Лепелі.

Ці лічылі вы, колькі разоў за суткі ў г. Лепель прыходзіць цягнік? Як адзначыў Ілья Анатольевіч, двойчы – грузавы цягнік і столькі ж – пасажырскі. Грузавым прыбываюць тукі на ААТ «Лепельаграсэрвіс» і філіял «Лепельскі» ЗАТ «Віцебскаграпрадукт». Таксама прывозяцца збожжавыя, шрот, нафтапрадукты, шчэбень і г.д. З Лепельскага раёна, як правіла, адпраўляюцца лесаматэрыялы, малочная прадукцыя і прамысловая сыравіна.

– Наш калектыў – надзейны і зладжаны, укамплектаваны па ўсіх спецыяльнасцях. Цякучасці кадраў няма, – кажа малады кіраўнік. – Важнымі якасцямі любога чыгуначніка лічу адказнасць і дысцыплінаванасць, паколькі захаванне бяспекі руху цягнікоў не дазваляе вольнасцяў. Працаваць даводзіцца ў любы час сутак і любое надвор'е, бо рух не спыняецца ні на хвіліну.

Напярэдадні прафесійнага свята хочацца ад усёй душы павіншаваць усіх супрацоўнікаў, ветэранаў галіны з Днём чыгуначніка і пажадаць ім, іх блізкім моцнага здароўя, асабістага шчасця і дабрабыту. Няхай ва ўсіх справах ім спадарожнічае толькі поспех!

**Ад рэдакцыі:** *Мы далучаемся да шчырых віншаванняў кіраўніка і жадаем работнікам чыгуначнай станцыі «Лепель», каб і надалей іх адказная праца прыносіла толькі радасць і задавальненне! Няхай кожны дзень гэтых адданых справе людзей будзе напоўнены толькі радаснымі хвілінамі і шчаслівымі падзеямі! Са святам вас, сябры!*



Работнік Лепельскага лясгаса Мікалай Бародзіч падчас загрузкі вагонаў абразной дошкай, якая пойдзе на Азербайджан

Тэкст і фота:
**Наталля ХРАПАВІЦКАЯ**
natalya.hrapovitskaya@gmail.com

